

**Раённая алімпіяда**
**па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет»**
**4 клас**
**2021/2022 навучальны год**

| | |
|---|---|
| **Шыфр** | |
| **Сума балаў** | |
| **Працэнт выканання** | |

| № п/п | Заданні | Коль-каць балаў |
|---|---|---|
| **1.** | **Як называецца частка свету, у якой знаходзіцца Рэспубліка Беларусь:** Еўропа, Еўразія, Азія?<br>**У якіх паўшар'ях Зямлі знаходзіцца наша краіна:** Паўднёвым або Паўночным, Заходнім або Усходнім?<br>*Правільныя адказы падкрэслі* | |
| **2.** | **Што такое веча? Падкрэслі адказ:**<br>1) збор княжацкіх дружыннікаў;<br>2) сход князя і яго дружыннікаў;<br>3) старажытны агульнанародны сход;<br>4) саюз князёў. | |
| **3.** | **З дадзеных назваў складзі ланцужок воднага шляху "з варагаў у грэкі":**<br>Дняпро, Балтыйскае мора, Заходняя Дзвіна, Чорнае мора, волак<br>______________________________________________<br>______________________________________________ | |
| **4.** | **Знайдзі памылку, закрэслі яе, напішы правільныя словы або лічбу.**<br>1) Абласнымі гарадамі з'яўляюцца Брэст, Орша, Полацк, Гродна, Магілёў, Мінск.<br>2) Працягласць нашай краіны з поўначы на поўдзень 520 км, а з захаду на ўсход – 650 км.<br>3) Наша краіна размяшчаецца ў самым цэнтры Азіі.<br>4) Плошча нашай краіны каля 307 квадратных км. | |
| **5.** | **Напішы:**<br>✓ Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь --------------------------- ---- ----- -<br>✓ Сталіца нашай дзяржавы ---------------------------------------------- -------<br>✓ Галоўныя сімвалы дзяржавы ------------------------------------------ --------<br>✓ Асноўны закон нашай дзяржавы -------------------------------------- -------<br>✓ Калі адзначаюць Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь --------- ----- | |
| **6.** | **На палях Беларусі вырошчваюць збожжавыя культуры: жыта, пшаніцу, авёс, ячмень. З якіх культур пякуць хлеб, а з якіх робяць крупяныя вырабы?**<br>Хлеб:……………..<br>Крупяныя вырабы:……………. | |
| **7.** | **Якую раку ў Беларусі назвываюць незвычайнай? Чаму?** | |

| | | |
|---|---|---|
| **8** | **Чым знакаміты беларускія гарады?**<br>Жодзіна ____________________________________________________<br>Салігорск ____________________________________________<br>Астравец ______________<br>Наваполацк ________________<br>__________________________________________________________ | |
| **9.** | **Успомні прозвішчы беларускіх пісьменнікаў. Насупраць кожнай літары запішы па 2 прозвішчы пісьменнікаў. (Літара можа быць у пачатку, сярэдзіне, канцы прозвішча)**<br>М<br>_______________________________________________________<br>О<br>________________________________________________________<br>В<br>_______________________________________________________<br>А<br>________________________________________________________ | |
| **10.** | **Адгадайце, якія дрэвы вялі гэтую гутарку.**<br>Расхвалілася дрэва сваім восеньскім уборам:<br>- Прыгажэй маёй вопраткі не прыдумаеш: тут і чырвонае, і зялёнае, і ружовае, і памяранцавае (оранжевое), і жоўтае. У іншага ліста што ні вугалок, то іншы колер.<br>- А я лічу, што такі пярэсты ўбор для самавітага(солидного) дрэва непрыстойны, - сказала суседняе дрэва. - Самы сціплы і самы прыгожы колер - зялёны. Я гэтаму колеру ніколі не змяню. Так і ападзе маё лісце зялёным. І куткі-то ў цябе на лісці - лішняе. Значна лепш дробныя зубчыкі, як у мяне.<br>*Адказ:* _________________________________________________ | |